Выстаўка

# ГРОДНА НАТХНЯЕ

## Горад вачыма фотамастакоў з Беларусі, Расіі, Польшчы і Славакіі

**Горад над Нёманам адлюстравалі ў сваіх работах аматары і прафесіяналы — члены народнага фотаклуба «Гродна». Гэта свайго роду прызнанне аўтараў у любові да старажытнага горада.**



— Тут і будынкі, і прыгожыя дзяўчаты, і хвіліны свят, канцэртаў... Усё, што парадавала вока фотамайстроў, а іх у выстаўцы ўдзельнічае паўсотні, прадстаўлена каля 200 работ. Упершыню ўдзельнічае некалькі замежнікаў. Яны бывалі ў нашым горадзе. Гэта майстры з Польшчы, Расіі, Славакіі, — расказвае нязменны **старшыня фотаклуба Аляксандр ЛАСМІНСКІ.**

У кожнага аўтара свая тэма. Але многія адгукнуліся на актуальныя праблемы. Напрыклад, Андрэй Ветраў выбраў тэму каранціна: па пустой вуліцы горада ідзе выпускнік-2020 з лентай і ў масцы. У экспазіцыі шырока прадстаўлены гістарычныя аб'екты, у прыватнасці, Стары замак, дзе цяпер вядзецца рэканструкцыя.

На здымках можна ўбачыць усе этапы работы. Вядома, гэта знакавы аб'ект горада, адсюль пачалася гісторыя Гродна, таму ён заўсёды цікавы. Звяртаюць на сябе ўвагу вобразы прыгожых гараджанак. Замежнікі кажуць, што ў Гродне самыя прыгожыя жанчыны, і калі глядзіш на фотаздымкі, з гэтым нельга не пагадзіцца. Шмат сваточных фота. Сапраўды, Гродна — горад фестываляў, канцэртаў, увогуле мастацтва. Цікава, што ў многіх аўтараў прафесія звязана менавіта з мастацтвам. Напрыклад, Аляксандр Луцэнка — былы акцёр Гродзенскага драмтэатра, які працаваў тут больш за 30 гадоў. На выстаўцы можна ўбачыць яго фота з тэатральнага жыцця. Але ён таксама вельмі любіць рабіць здымкі людзей, асабліва сталых і малых.

А вось прафесійны музыкант Аляксандр Пасечнік шукае ў горадзе новыя формы. Дакладней, лініі. Як аказалася, ён вельмі любіць геаметрыю і нават прадстаўў на гэту тэму асабістую выстаўку. Вось і зараз яго здымкі перагукаюцца з мастацтвам кубізму:

— У горадзе з'явіліся новыя лініі — вялізны гандлёва-забаўляльны цэнтр «Трыніці». Таму ў мяне ўзнікла ідэя зрабіць такія здымкі з лініямі. Я пайшоў а дзявятай гадзіне вечара, і да сямі раніцы хадзіў вакол будынка, каб зняць яго ў розных ракурсах. Зрабіў здымкі закаханай пары, якія таксама сустракалі світанак, і назваў гэтую кампазіцыю — «Ад рамантыкі да авангарда».

Не магу не расказаць пра члена клуба Людмілу Сцяцкевіч, чые работы з гарадскога жыцця таксама ўдзельнічаюць у выстаўцы. Жанчына вядзе барацьбу з цяжкай хваробай. Па ўсім відаць, што нават нязначны рух патрабуе ад яе істотных намаганняў. Каля сваіх работ Людміла расказвае, што кадр «падглядзела» падчас паездкі ў гарадскім транспарце. Яна шукае сюжэты паўсюдна. Нават кот у акне можа стаць героем яе фотаздымка.

— Калі са мной такое здарылася, я была рада, што магу здымаць. Я люблю гуляць па горадзе, здымаю закаты, нейкія гарадскія сцэнкі, раблю сэлфі, — расказвае Людміла. — Цяпер больш часу менавіта для творчасці. У мяне перыяд шчасця. Чымсьці прыйшлося ахвяраваць, але адкрыліся іншыя магчымасці, і гэта таксама трэба цаніць.

Вось такія яны, творчыя асобы, якія імкнуцца спыніць прыгожыя імгненні гарадскога асяроддзя. Дарэчы, на выстаўцы ёсць і работы фотакарэспандэнта «Звязды» Яна Хведчына, маладога фатографа, гродзенца, удзельніка фотаклуба «Гродна».

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

# ТАЙНЫ КАНЦЫЛЯРЫІ МІНУЛЫХ ЧАСОЎ

**У Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстаўка «Тайны канцылярыі», якую музейшчыкі стварылі сумесна з даследчыкам, лаўрэатам прэміі «За духоўнае адраджэнне» Уладзімірам ЛІХАДЗЕДАВЫМ.**



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

На думку самога калекцыянера, гэта экспазіцыя раскрывае гісторыю беларускага пісьменства з нязвыклага ракурсу:

— Нам хацелася паказаць, пры дапамозе чаго і на чым пісалі нашы продкі. Выстаўка ахоплівае перыяды развіцця пісьменнасці з даўніны і па 1945 год.

— Мы сёння знаходзімся на адкрыцці выстаўкі, здавалася б, звычайнай. Усе мы з вамі карыстаемся прыладамі для пісьма, але далёка не заўсёды задумваемся, як тэхналогія пісьма з'явілася і як яна паўплывала на развіццё цывілізацыі, — заўважыў **намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь СУША.** — Тэму экспазіцыі мы задумалі разам з Уладзімірам Ліхадзедавым некалькі гадоў таму, калі адбывалася святкаванне 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, і ладзіліся розныя кшталту выстаўкі, дзе дэманстраваліся рукапісы, старадрукі і многае іншае. Я бачыў, як загараліся вочы ў людзей, калі яны разглядалі старыя пісьмовыя прылады. Гэты выставачны праект — першая ў гісторыі краіны спроба маштабна паказаць гісторыю развіцця пісьменства праз такія артэфакты. Шмат адкрыццяў тут зможа зрабіць кожны. І гэта толькі пачатак. Шмат таямніц канцылярыі мы яшчэ плануем адкрыць як у сценах бібліятэкі, так і ў віртуальнай прасторы.

На выстаўцы наведвальнікі ўбачаць, чым пісалі нашы продкі ў XV—XX стст., першыя алоўкі і асадкі, пер'ячысткі, пясочніцы, чарніліцы і іншае. А яшчэ можна будзе даведацца, які тавар айчынных і замежных вытворцаў быў хадавы ў канцылярскіх і папяровых крамах Мінска і Гродна ў старыя часы, як і што рэкламавалі на канцылярскіх прадметах пачатку XX ст., якія адмысловыя пісьмовыя прылады клалі ў саквояж падарожнікі.

У сваю чаргу **дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** адзначыў:

— Уражвае ўсё сабранае тут. Але не толькі колькасна, але і, безумоўна, сутнасна. Напрыклад, асобны раздзел прадстаўляе паперу беларускай вытворчасці, якая прадавалася ў гандлёвых крамах паўсюль. Уладзімір Аляксеевіч разам з гэтай калекцыяй сабраў і процьму фактаў з гісторыі пра тыя ці іншыя экспанаты. Вельмі хацелася б, каб гэта знайшло адлюстраванне ў яго новых кнігах.

Дарэчы, асобную частку выставы займае школьная тэма, дзе выяўляецца змесціва ранца гімназістаў розных эпох (сшыткі, алоўкі, асадкі, тачылкі, закладкі, пеналы), і нават дэманструецца, як выглядала парта ліцэіста Аляксандра Пушкіна... Яшчэ экспазіцыя прадстаўляе пісьмовыя прылады вядомых асоб — князёў Радзівілаў, родных кампазітара Станіслава Манюшкі, краязнаўцы і гісторыка Отана Гедэмана, фінансіста Палякова, нямецкага фатографа Фрыца Краўскопфа, маршала Ціманшэнкі і іншых. Для сапраўдных «гурманаў канцылярыі» прадстаўлены пісьмовыя наборы, чарніліцы ў розных мастацкіх стылях, а таксама ўзоры пісьмовых прылад высокамастацкай работы з каштоўных матэрыялаў.

Варта адзначыць, што экспазіцыя падрыхтавана ў межах праекта Уладзіміра Ліхадзедава «У пошуках страчанага» і дазваляе праз прадметы аўтарскай калекцыі адкрыць забыты пласт матэрыяльнай культуры.

Выстаўка «Тайны канцылярыі» будзе працаваць да 15 лістапада 2020 г. штодзень, акрамя панядзелка і дзяржаўных свят. Уваход — вольны.

**Алена ДРАПКО.**

# Рэальная падтрымка

## У Мінскай вобласці звыш 22,8 тысячы шматдзетных сем'яў атрымалі матэрыяльную дапамогу для падрыхтоўкі дзяцей да школы, паведаміла прэс-служба Мінаблвыканкама

**Адзін з відаў падтрымкі — згодна з дзяржпраграмай «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» на 2016—2020 гады (падпраграма «Сям'я і дзяцінства») — датычыцца сем'яў, якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей. Так, ім выплачана аднаразовая матэрыяльная дапамога для падрыхтоўкі дзяцей да школы ў памеры да 30 % бюджэту пражытковага мінімуму. На 14 верасня яе атрымалі 17,3 тысячы сем'яў. Сума фінансавай падтрымкі склала звыш Br2 млн.**

Матдапамога малазабяспечаным і шматдзетным сем'ям выплачвалася і з іншых крыніц: па месцы працы бацькоў, праз аказанне дзяржаўнай адраснай сацыяльнай і гуманітарнай дапамогі, падчас правядзення дабрачынных акцый, за кошт спонсарскіх сродкаў. З 1 ліпеня да цяперашняга часу адрасную дапамогу атрымалі 515 малазабяспечаных сем'яў, якія выхоўваюць 808 школьнікаў. Дапамога для падрыхтоўкі дзяцей да школы па месцы працы бацькоў аказана больш як 7,7 тысячы малазабяспечаных і шматдзетных сем'яў, або 13 тысячам школьнікаў.

Усяго розныя віды дапамогі атрымала больш за 22,8 тысячы шматдзетных сем'яў, у якіх выхоўваюцца 45,9 тысячы школьнікаў, і больш за 5 тысяч малазабяспечаных сем'яў — 6608 школьнікаў. Сумы выплат склалі Br2,8 млн і Br638 тыс. адпаведна.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Фестывалім!

# «КЛЁВАЕ МЕСЦА»

## Так называецца свята, якое правялі днямі ў аграгарадку Барсукі Докшыцкага раёна, што на Віцебшчыне

**Як растлумачыла карэспандэнту "Звязды" кіраўнік Барсукоўскага сельскага Дома культуры Алена СКУМС, гэта мерапрыемства — адзін з брэндаў раёна. У кожнай аналагічнай установы ёсць «аўтарскі праект». А ў гэтым населеным пункце, які прыкладна за пяць кіламетраў ад райцэнтра, вырашылі назваць яго «Клёвае месца», бо мясцовае возера славіцца добрымі ўловамі.**



Але такое свята — не спаборніцтва для рыбакоў з канцэртнай часткай «на закуску», а, можна сказаць, цэлы міні-фестываль. Яго правялі ўпершыню больш за пяць гадоў таму. І адразу феерычны фэст палюбіўся месцічам і гасцям, якія спецыяльна прыязджаюць па прыемныя эмоцыі ў глыбінку.

На мерапрыемстве было шмат цікавага. І яно традыцыйна спадабалася людзям розных узростаў. У прыватнасці, арганізавалі конкурсы дзіцячых калысак, аформленых у «водным стылі», рыбных страў, вызначэння, з якой рыбы зроблена юшка... Пераможцы атрымалі прызы.

Запомніцца надоўга і шыкоўная канцэртная праграма з удзелам самадзейных калектываў, а таксама пантаміма.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота дадзена арганізатарамі мерапрыемства.**